# АДЫСЕЯ ОСТАРБАЙТАРА З ПАРХІМАЎЦАЎ

## Успаміны У. І. Шымавалоса, в. Пархімаўцы



*У.І. Шымавалос.*

Пачатак жніўня 1943 года. Моладзь з навакольных вёсак вывозілі ў Германію. Падышла чарга і майго, 1922 года нараджэння. 2 жніўня, помню, павёз мяне брат возам з Каленік, дзе я жыў з бацькамі, у Бераставіцу. Мяшок з харчамі пакінулі ў хаце, бо верылі, што неяк удасца адкупіцца ад няволі. Але не ўдалося.

...Выгрузілі нас ва Усходняй Прусіі, непадалёк ад Штальпіна. Рэгістрацыя, здымак у анфас і профіль, з нумарам над галавой. Мой - 513. Нумар нямецкага парабка. Непадалёк, у сельгаспрадпрыемстве, утрымліваліся на рабоце ваеннапалонныя. Іх адправілі ў лагеры, а нас - у іх барак за дротам. Далі на абед варанага бобу. Як з'еў яго пасля голаду - так і схапіўся за жывот. Качаюся па падлозе. Мо і памёр бы, каб не прынеслі нешта выпіць.

А потым усіх нас адвезлі ў «арбацайн». Там ужо, пэўна, былі заяўкі на парабкаў ад гаспадароў. Урэшце з'явіўся і мой баўэр. Ён аказаўся эсэсаўцам, на шапцы - чэрап і косці. Меў 500 маргоў зямлі, два трактары. Я быў пры конях, паляк стальмашыў, яшчэ парабкавалі літовец, немец. І беларус - даяр Аляксей з-пад Скідаля. Можна сказаць, мой зямляк. Жылі мы ў хляве, спалі на нарах з аполкаў. Рабілі з 8 гадзін ранку да 8 вечара. Раз у суткі елі посны суп, а раніцай і вечарам былі хлеб, ледзь-ледзь змазаны маргарынам, чорная кава або маслянка. Прысмакі - галушкі з крыві качак.

У баўэра я парабкаваў год.

Але ішоў ужо 1944 год. Фронт набліжаўся, баі грымелі ў Літве. Гаспадар уцёк. Старэйшых за мяне парабкаў забраў з сабой - гнаць і даіць кароў. Я ж апынуўся ў рабочым лагеры. На кожныя дзесяць чалавек - аўтаматчык. І рабочая норма - штодня 12 метраў акопаў, па паўтары метры у глыбіню і 1 метр у шырыню...

Акопы капалі дзе папала. Крушня трапіцца, значыць, камяні варочаеш, і назаўтра ледзь трымаеш лапату. Зарасло месца хмызняком - выкарчоўваеш. Сказаць, што было цяжка - нічога не сказаць. Падчас бывала так, што хацелася ўпасці і не ўстаць ніколі. Але голад быў страшнейшы за работу. Есці хацелася кожную хвіліну. Каб не стома, то голад не даў бы заснуць. Усе сны ноччу былі пра ежу.

На першым часе была ў лагеры кухня. Гатавалі чай і давалі нам па літру ў суткі. І па 300 грамаў хлеба. Але кухню разбамбілі. І мы самі шукалі сабе харч. На сметніку, дзе стаяла якая нямецкая ваенная часць, знойдзеш, бывала, галаву селядца ці рэшткі кансервы, скарынку хлеба.

Але такія знаходкі былі рэдкасцю. Найчасцей галадалі. Рабіць жа мусілі. Не можаш, дык пойдзеш у «расход». Таму ратаваліся, шукалі ежу, хто як мог. На адным месцы нас доўга не трымалі. Выкапалі акопы - гоняць далей, на поўнач, да Балтыкі. Усе мы ледзь трымаліся на нагах. Выратоўвала тое, што былі маладыя. Хоць засталіся ад нас скура і косці. Помню, загналі ў лагер Штутгаф. Раптам бачу, ідзе насустрач дзяўчына з суседняй вёскі - Каленікаў.

- Ніна! — узрадавана крычу ёй. - Ніна!

Ніна угледзелася пільней і пляснула рукамі «Як жа цябе пазнаеш? Скура ды косці».

Пачалі мы хварэць. У той час мы начавалі ў лагерных бараках пад Пілау. Тых, у каго моцны жар і непрытомнасць, выносілі ў спецыяльную зямлянку. Паміраць. Там былі нары у некалькі ярусаў.

Ідзеш, бывала, на работу ці з работы і са страхам паглядваеш у дальні куток лагера. Моліш Бога, каб не трапіць у той «ізалятар». Аднак хутка хлопцы, суседзі па нарах, прынеслі туды і мяне, непрытомнага. Казалі потым, што праляжаў там дні тры-чатыры. Яны ўжо і не разлічвалі ўбачыць мяне ў жывых. Але малады арганізм перамог. Апрытомнеў.

Потым немец прывёў хлопцаў, каб прыбралі мёртвых. І высветлілася, што я - жывы.

- Пастаўце яго на ногі, - загадаў немец.

Хлопцы знялі мяне, паставілі. Але праз секунду я упаў...

- Два дні паляжыць у лагеры і - на работу, - загадаў той.

Так пасля «ізалятара» я трапіў у «санаторый». І там зразумеў, што пабываў на «тым свеце». І што гэта - маё другое нараджэнне.

Быў красавік 1945 года. Мы з прагнасцю ўслухоўваліся: фронт набліжаецца. Цяпер мы на адным месцы амаль не затрымліваліся. Усё шпарчэй гналі нас у бок Балтыкі. І вось - нешырокі, але глыбокі заліў, а за ім Куршская каса. Сагналі на пераправу тысячы палонных. Тут і мужчыны, і дзяўчаты, і жанчыны з дзецьмі. Рускія, беларусы, палякі, французы... Пагрузілі ноччу на паром. Толькі адплылі - у небе нашы самалёты. Казалі, яны рэгулярна бамбілі пераправу нямецкіх часцей. А тут толькі асвяцілі паром і здалёк кінулі справа і злева па бомбе. Але немцы кінуліся ў паніку. Яна перадалася і палонным. Людская маса рухнула, зламала поручні парома. Многія ўтапіліся. Мяне выратавала тое, што я быў пасярэдзіне натоўпу. Упаў, але схапіў некага за нагу, змацаваўся.

Назаўтра нас усё ж пераправілі… Куршская каса. Пясок. Сосны. Бачым, нейкі незнаёмы сцяг у вышыні. Побач - белы з чырвоным крыжам. Гэта, як высветлілася, італьянскія і французскія лагеры Чырвонага Крыжа.

Немцам ужо ж добра прыпякло, даймала іх наша авіяцыя.

...Помню, два тыдні стаялі мы ў ляску. Усе два тыдні ліў дождж. Прамоклі да ніткі. А неяк ранкам - мароз. Чаравікі мае так змерзліся, што не ўсунуў ног. Паўдня ішоў босы. І вось, калі зноў пагналі некуды уздоўж шашы, мы са Стасем, маім сябруком - палякам, вырашылі ўцячы. Ужо ўсё роўна было: застрэляць, дык не будзем хоць пакутаваць. Схаваліся за бліжэйшыя дрэвы і драпанулі ў лес. Блукалі доўга, пакуль у цемры не натрапілі на нейкі хлеў. Раніцай высветлілася, што мясцовы баўэр уцёк. Стась пайшоў на разведку ў суседні маёнтак. А я вырашыў зайсці ўсё ж у дом: можа, знайду што паесці? Калі драўляная лесвіца на другі паверх заскрыпела ад маіх крокаў, у праёме дзвярэй раптам узнік нямецкі афіцэр з рэвальверам.

- Хто ты і што табе трэба? - спытаў па-нямецку.

Як умеў, на яго ж мове растлумачыў, што я остарбайтэр. Хачу есці. Хлеба.

Афіцэр прынёс з пакоя бохан хлеба і высокую кансерву. Спытаў: «Чаму ты дрыжыш?»

Я паказаў мокрае асенняе паліто (каб не зняў яго са сцяны ў хляве ўцёкшага баўэра, то, пэўна, замёрз бы), свой мокры саматканы пінжак. За два тыдні пад дажджом на мне не было сухой ніткі.

Афіцэр загадаў пачакаць. І хутка вярнуўся з лётчыцкай курткай у руках: зверху сіні шоўк, а падбіта штучным футрам. Працягнуў мне. Я не чакаў такога. Падзякаваў, павярнуўся ісці, але спіна ныла ў чаканні кулі. Я ведаў, што фашысты гэтак вось любяць пазабаўляцца. Аднак афіцэр, відаць, шчыра паспачуваў мне. І ўпершыню за доўгія гады сваіх пакут я зразумеў, што і сярод немцаў ёсць людзі.

Неўзабаве мы са Стасем даведаліся пра капітуляцыю фашысцкай Германіі. Не перадаць словамі, якое гэта было шчасце! Потым служба ў арміі. Праўда, паваяваць мне не давялося. Вайна скончылася.

Успаміны Уладзіміра Іосіфавіча Шымавалоса запісала дачка Марыя Драпеза, в. Пархімаўцы, 1997 год.